CORE Metadata, citation and similar papers at core.ac.uk



**УДК 340.1**

# АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ ПРАВА БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

***Дз.В. ШЧЭРБІК***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт)***

*Праблема дыскрэтнасці і пераемнасці разглядаецца ў дачыненні да прававога развіцця перыяду Расійскай імперыі. Паказваецца ўплыў падзелаў Рэчы Паспалітай, страты дзяржаўнасці Вялікага княства Літоўскага і далучэння земляў Беларусі да Расіі на пераемнае развіццё права Беларусі. Аналізуецца наданне землям ВКЛ прававой аўтаноміі, ацэньваецца яе аб'ем у сферы дзяржаўнага права, прававога статусу насельніцтва, грамадзянскага права, судовай сістэмы і працэсуальнага права, прасочваецца працэс уніфікацыі права літоўска-беларускіх губерняў з агульнаімперскім правам.*

*Рэформы другой паловы XIX стагоддзя, якія праводзіліся на тэрыторыі Беларусі з некаторымі выключэннямі, і дэмакратызацыя пачатку XX стагоддзя спрыялі развіццю самакіравання на беларускіх землях. Змена пакаленняў і дэмакратызацыя ў Расійскай імперыі дазволілі ў канцы XIX – пач. XX стагоддзя большасці насельніцтва ўспрымаць дзейснае на тэрыторыі Беларусі права як сваё.*

**Уводзіны.** У другой палове XVIII стагоддзя землі Беларусі былі далучаныя да Расійскай імперыі. Пасля трох падзелаў перасталі існаваць Рэч Паспалітая і Вялікае княства Літоўскае як яе складовая частка. Падзеі, што адбываліся на землях Беларусі ў часы Расійскай імперыі, паўплывалі на будучыню дадзенай тэрыторыі [14, с. 157], таму неабходна разгледзець найбольш важныя дзяржаўна-прававыя працэсы гэтага перыяду з пункта гледжання пераемнасці і дыскрэтнасці ў развіцці права.

**Асноўная частка.** Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай у прававой гісторыі Беларусі адбыліся кардынальныя змены. Далучаныя землі адразу ж былі ўключаныя ў працэс уніфікацыі расійскага імперскага заканадаўства, які пачаўся ў 2-й палове XVIII стагоддзя [13]. Праўда, на новых землях, уключаных у гэты перыяд у склад Расіі, уніфікацыйныя працэсы выяўляліся не адразу і слабей, бо расійскія ўлады баяліся выклікаць у нядаўна набытых правінцыях сепаратысцкія настроі.

Па ўказанай прычыне ў першыя дзесяцігоддзі пасля анэксіі земляў не адбылося поўнай адмены права, што дзейнічала на дадзенай тэрыторыі, і замены яго расійскімі законамі. Фактычна да сярэдзіны XIX стагоддзя мела месца прававая інтэграцыя, калі мясцовае права ўключалася ў права каланізатара ва ўсіх сферах, дзе не існавала відавочных супярэчнасцяў. Так, яшчэ 28 мая 1772 года ў «Наказе Екатерины II генерал-губернаторам Псковской и Могилевской губерний об организации управления в присоединенных от Польши землях» указвалася: «Суд и расправа внутренние тех провинций в личных делах имеет производиться по их законам и обыкновениям и их языком во всех тех случаях, кои не дотрагиваются до власти нашей. Дела же, нарушающие спокойствие и тишину граждан, да будут ведомы не в иных местах, как в тех, кои от власти верховной на то устроены...» [9]. Дадзенае становішча пацвярджалася і ва «Указе Екатерины II генерал-губернатору Белорусских губерний об организации управления в присоединенных землях» ад 16 жніўня 1772 года [8], і ў «Манифесте генерал-губернатора об организации управления и судов на присоединенной к России по третьему разделу Речи Посполитой» ад 17 снежня 1795 года [10].

Фактычна ў канцы XVIII – першай трэці XIX стагоддзя ў грамадзянскім судаводстве дзейнічалі нормы Статута ВКЛ 1588 года, пацверджанага Паўлам I, соймавыя канстытуцыі, а крымінальны працэс, дзяржаўнае кіраванне, прававы статус насельніцтва ў асноўным рэгуляваліся агульнаімперскімі законамі.

У сферы дзяржаўнага права адбыўся разрыў пераемных сувязей з папярэднім этапам развіцця права. Канстытуцыйную манархію Рэчы Паспалітай, у Канстытуцыі якой абвяшчаўся падзел уладаў, падзаконнасць улады караля і ўраду, змяніла абсалютная самадзяржаўная ўлада расійскіх імператараў.

Палітычныя правы і свабоды шляхты, якія ў большасці сваёй у выніку рэформаў канца XVIII стагоддзя ў Рэчы Паспалітай павінны былі стаць даступнымі гараджанам, расійскай уладай фактычна ліквідаваліся. Першым чынам гэта закранала магчымасць праз прадстаўнікоў удзельнічаць у заканадаўчай дзейнасці, а таксама ў складзе мясцовых прадстаўнічых органаў выбіраць службовых асоб мясцовага кіравання, фармаваць судовыя органы і інш. Неабмежаваная ўлада імператара ў Расіі не дапускала свайго абмежавання, рэалізоўвалася праз вялікі бюракратычны апарат кіравання.

Пасля распаўсюджвання на шляхту дзеяння «Жалованной грамоты дворянству» 1785 года яна набывала тыя ж правы, што і дваранства імперыі [3]. У новаўтвораных губернях на тэрыторыі Беларусі і Літвы шляхце было дазволенае кожныя тры-чатыры гады збіраць сходы, якія ў дакументах канца XVIII – першай

чвэрці XIX стагоддзя традыцыйна зваліся соймікамі. Фактычна дваранскія сходы адыгрывалі ролю карпаратыўных органаў дадзенага саслоўя. Асноўнай іх мэтай было абранне губернскіх і павятовых правадыроў дваранства (маршалкаў), прадстаўнікоў у саслоўныя суды і ўстановы, абмеркаванне раскладак земскіх павіннасцяў, рашэнне гаспадарчых і грамадскіх спраў мясцовага жыцця.

Аднак і без таго зменшаныя правы шляхты былі ўрэзаны з-за перасцярог у яе нядобранадзейнасці. У 1777 годзе шляхце было забаронена самавольна збірацца на сойміκі. Указам ад 14 снежня 1799 года былі ліквідаваныя губернскія дваранскія сходы. Губернскія маршалкі дваранства выбіраліся з вузкага кола павятовых маршалкаў, а не з усёй шляхты губерні. Земскія спраўнікі, якія ўзначальвалі ніжнія земскія суды – галоўныя органы ўлады з адміністрацыйна-паліцэйскімі функцыямі ў паветах, у адрозненне ад цэнтральных паветаў Расіі, не абіраліся дваранствам, а прызначаліся Сенатам са згоды міністра ўнутраных спраў па прадстаўленні губернатара.

Для ўдзелу ў дваранскім сходзе для шляхты ўводзіўся маёмасны цэнз, які абмяжоўваў правы шляхты, а распачаты пасля падзелаў «разбор шляхты», г.зн. неабходнасць пацвярджаць сваё паходжанне дакументальна, канчаткова пазбавіў значную частку малазямельнай шляхты палітычных правоў разам з дваранскім званнем.

На тэрыторыі Беларусі неаднаразова змянялася адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне, але ў 1801 годзе былі заснаваныя пяць губерняў, якія і праіснавалі аж да рэвалюцыі 1917 года. У губернях Беларусі была заснаваная сістэма мясцовых органаў улады і кіравання, прадугледжаная Законам «Учреждения для управления губерний Всероссийской империи» 1775 года. Кіраванне губернямі ўяўляла сабой сістэму бюракратычных органаў пры губернатарах, фактычна неабмежаваных у сваёй дзейнасці прадстаўнічымі органамі дваранскага саслоўя, што радыкальна адрознівалася ад мясцовага кіравання Рэчы Паспалітай.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай у гарадах некаторы час дзейнічала магдэбургскае права. У «Наказе Екатерины II генерал-губернаторам Псковской и Могилевской губерний об организации управления в присоединенных от Польши землях» ад 28 траўня 1772 года ўказвалася: «Города оставьте на их правах и привилегиях на первый случай и каждому из них не препятствуйте просить у нас о подтверждении сих...» [9].

З 1801 года на тэрыторыю Беларусі было распаўсюджанае дзеянне Гарадавога ўстава і «Жалованной грамоты», дадзенай гарадам у 1785 годзе. З гэтага часу фактычна былі адмененыя ўсе прывілеі, дадзеныя гарадам Беларусі, але канчаткова былі ліквідаваныя асаблівасці ў складзе гарадскіх магістратаў Беларусі толькі пасля 1830 года, калі па ўказу імператара на тэрыторыю Беларусі было цалкам распаўсюджана дзеянне заканадаўства Расіі і спынена дзеянне Статута 1588 года.

Паліцыя гарадоў цалкам падпарадкоўвалася ўрадавым органам. У яе кампетэнцыі знаходзілася падтрыманне парадку, падатная справа прыналежала казённым палатам, суд быў залежны ад мясцовай адміністрацыі. Саслоўныя гарадскія органы займаліся толькі пытаннямі гарадской гаспадаркі і ўсім тым, што звязана з гарадскімі «карысцю і патрэбамі». Аднак нават дадзеная гаспадарчая дзейнасць абмяжоўвалася вузкай фінансавай базай і празмернай апекай з боку губернатара.

Такім чынам, у адрозненне ад перыяду Рэчы Паспалітай, органы гарадскога самакіравання гарадоў Беларусі пасля далучэння да Расійскай імперыі «адыгрывалі ролю бездапаможнага адміністрацыйна-гаспадарчага прыдатку да апарата адміністрацыі і паліцыі» [6, с. 113], але нават падобнае становішча выгодна адрознівалася ад статусу магістратаў рускіх гарадоў, якія выконвалі толькі чыста судовыя функцыі [15, с. 17].

У выніку першых двух падзелаў Рэчы Паспалітай у структуру судовай сістэмы на беларускіх землях былі ўнесеныя некаторыя змены, але па ўказах Паўла I ад 12 снежня 1796 года і ад 6 лютага 1797 года ў губернях на тэрыторыі Беларусі была адноўлена з некаторымі зменамі ранейшая сістэма судовых органаў. Вяртанне да структуры судовай сістэмы ВКЛ аказалася недаўгавечным, амаль адразу ж пачынаецца яе паступовая змена ў накірунку агульнаімперскіх парадкаў, але нават у першай трэці XIX стагоддзя некаторыя адрозненні і асаблівасці захоўваліся [16, с. 12]. Даўжэй за ўсё ў беларуска-літоўскіх губернях са старой судовай сістэмы захаваліся гродскія суды (у Віцебскай, Магілёўскай і Менскай губернях да 1795 г., у Віленскай і Гарадзенскай да 1831 г.), кампрамісарскія і эксдзівізарска-таксатарскія суды (да 1840 г.).

У адрозненне ад нормаў дзяржаўнага права, кардынальныя змены ў якім адбыліся пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, а нязначныя адрозненні ад агульнаімперскага дзяржаўнага права павольна сціраліся ў першай трэці XIX стагоддзя, у сферы прыватнага права асноўнай крыніцай заставаўся Статут ВКЛ 1588 года. Аднак і ў дадзенай сферы «ішоў паўзучы працэс уніфікацыі парцікулярнага права з агульнарускім» [12].

Па меркаванні А.А. Цесля, які даследаваў дадзенае пытанне, праект «Збору мясцовых законаў Заходніх губерняў», складзены ў II Аддзяленні пад кіраўніцтвам І.Н. Данілавіча да 1834 года, з'яўляецца яркім прыкладам істотнага звужэння сферы дзеяння права ВКЛ: «Замест цэласнай сістэмы права перад намі з'яўляецца набор шматкоў, які перамежваецца спасылкамі на агульнарускія законы, дзеянне якіх

было распаўсюджанае таксама і на гэтыя губерні, альбо ж на адмысловыя законы, прынятыя выключна ў дачыненні да заходніх губерняў, аднак уводзіўшых агульнарускія палажэнні» [12]. Падобнае меркаванне выказваў і даследчык пачатку XX стагоддзя А.Э. Нольдэ, які на аснове аналізу матэрыялаў падрыхтоўкі «Збору мясцовых законаў Заходніх губерняў» прыйшоў да высновы, што да 1840 года з усяго права заходніх губерняў «цэласнасць і некаторую завершанасць захаваў толькі грамадзянскі працэс» [7, с. 250]

У 1831 годзе на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў было адменена дзеянне ранейшых, атрыманых у спадчыну ад Рэчы Паспалітай, крыніц права і ўведзена агульнаімперскае права.

У канчаткова падрыхтаваным да 1837 года праекце «Збору мясцовых законаў Заходніх губерняў» уплыў мясцовых законаў адчуваўся ў сферы рэгулявання адносін атрымання спадчыны, парадку і ўмоў заключэння шлюбу паміж асобамі каталіцкай веры, у рэгуляванні сервітутаў, у спрошчаным парадку правіл падсуднасці па грамадзянскіх справах, у парадку разгляду і абскарджання грамадзянскіх спраў [2, с. 155]. Аднак «Збор мясцовых законаў Заходніх губерняў» не быў уведзены ў дзеянне як асобны закон, а 25 чэрвеня 1840 года Указам «О распространении силы и действия Российских гражданских законов на все Западные, возвращенные от Польши, области» прававая аўтаномія заходніх губерняў была адмененая, і ўжо на ўсёй тэрыторыі Беларусі дзейнічала расійскае агульнаімперскае права.

Некаторыя малазначныя адрозненні права заходніх губерняў ад агульнаімперскага права захоўваліся і ў далейшым, так як яны не падпалі пад дзеянне ўказу ад 25 чэрвеня, бо былі яшчэ раней уключаныя ў выдадзены ў 1832 годзе «Збор законаў Расійскай імперыі». З іх найбольш важнымі былі нормы аб кіраванні казённымі і арэндаванымі маёнткамі, якія рэгулявалі статус «паезуіціх» маёнткаў (захаваныя яны былі і ў Зборы 1842 года) [7, с. 251].

Такім чынам, да 30 – 40-х гадоў XIX стагоддзя ў праве Беларусі адбыўся канчатковы разрыў пераемных сувязей з папярэднім этапам развіцця права. З гэтага перыяду на дадзенай тэрыторыі дзейнічала выключна права Расійскай імперыі.

Насельніцтва Беларусі змагалася за адраджэнне дзяржаўнасці ВКЛ, узнаўленне яе прававой сістэмы. Так, М.К. Агінскі ў 1811 годзе прапаноўваў імператару Аляксандру I аднавіць ВКЛ у складзе Расійскай імперыі, увесці на яе тэрыторыі кіраванне ў адпаведнасці з Асноўным статутам ВКЛ (меркаванай канстытуцыяй), грамадзянскія адносіны і судовы працэс урэгуляваць Статутам ВКЛ 1588 года [1, с. 212 – 213].

Спробы ўзброенага аднаўлення дзяржаўнасці ў 1830 – 1831 і 1863 – 1864 гадах скончыліся паразай, але выкарыстанне К. Каліноўскім у прапагандзе сярод сялян супрацьпастаўлення «ронда польскага» і несправядлівых парадкаў «маскоўскіх» сведчыць пра яшчэ не поўнае ўкараненне новай сістэмы права ў свядомасці грамадства: «…найперш, каб не магло выrабляціся сумленне народнае, пакасаваў маскаль усе сходкі людзей выбарных, усе школы нашы, а так, абабраўшы з сумлення да і з розуму, а завеўшы ў нас свой парадак маскоўскі, пазволіў кожнаму дужшаму глуміцца над бедным як толька хоча... Мужыку не толька што не даў ніякага права, но яшчэ адабраў і тое права, якое ен меў ад ронду польскага… Кожнаму можна было мужыка крыўдзіць, а чыноўнікі маскоўскія не рабілі яму ніякай справядлівасці, но яшчэ калі суд на глум не ссылаў мужыка ў Сібір, то аддаваў на вечнасць у салдаты…» («Лісты з-пад шыбеніцы») [4, с. 301 – 302].

Да 80-х гадоў XIX стагоддзя падобная агітацыя страціла сэнс і пераважная большасць беларускіх палітычных арганізацый, пачынаючы з «Гоману», аж да першай сусветнай вайны бачыла развіццё Беларусі ў складзе Расійскай імперыі як яе аўтаномнай або федэратыўнай часткі. Стварэнне прававой аўтаноміі бачылася ім не праз адраджэнне элементаў права ВКЛ і Рэчы Паспалітай, а на аснове прагрэсіўнага рэфармавання расійскага заканадаўства.

Варта адзначыць, што радыкальнасць наступстваў разрыву пераемных сувязей у развіцці права Беларусі зніжалася з-за вестэрнізацыі расійскага права, якая ажыццяўлялася ў той перыяд, што зрабіла апошняе бліжэйшым праву ВКЛ, якое ўжо перажыло заходні ўплыў. Вестэрнізацыя ў Расіі пачалася з дзяржаўна-прававых рэформаў Пятра I у XVIII стагоддзі, якія складаліся з запазычанняў швецкага, дацкага, германскага і збольшага французскага права, фармавання шматгаліновай сістэмы права па заходнім узоры, секулярызацыі права.

Навукоўцы адзначаюць, што ў перыяд, калі беларускія землі былі далучаныя да Расійскай імперыі, у ёй пачыналіся шырокія кадыфікацыйныя працы, у выніку якіх пры адмове ад прамых запазычанняў была ажыццёўлена пабудова ўласнай рацыянальна арганізаванай прававой сістэмы па заходнім узоры, сфарміравалася расійская юрыдычная навука, адукацыя [5].

З-за вестэрнізацыі расійскага права такія яго дасягненні, як: «а) набыццё рускім правам заходняй галіновай структуры…; б) дамінаванне пісьмовага нарматыўнага прававога акта над іншымі крыніцамі права; в) пераход ад каўзальных прадпісанняў да абстрактна-агульных нормаў; г) выцясненне фармаль-

нымі момантамі (пісьмовая форма дамоваў, іх рэгістрацыя і інш.) традыцыйных, архаічных юрыдычных рытуалаў (рэлігійна-сімвалічных актаў, якія раней выконвалі ролю юрыдычных фактаў)…» [5], сталіся блізкімі характарыстыкам права ВКЛ, не выклікалі рэзкага адмаўлення ў жыхароў Беларусі.

Даследчыкі заходняга ўплыву на развіццё права Расійскай імперыі XVIII – пач. XX стагоддзя адзначаюць, што выключная роля дзяржавы ў правядзенні мадэрнізацыі не дазволіла Расіі «цалкам парваць з візантыйскім разуменнем права як волі ўлады, а дзяржавы як праваслаўнай імперыі – захавальніцы унікальнай ісціны, якую нельга даверыць самастойнай і актыўнай грамадзянскай супольнасці заходняга тыпу… Замест рацыянальнасці як свабоды разумнага выбару кожным індывідам свайго варыянта дзеяння была ўспрынятая рацыянальнасць як утылітарны разлік, калькуляцыя розных сацыяльных фактараў дзеля таго, каб дамагчыся найбольш аптымальнага, з пункта гледжання калькулюючага, паводзін свайго і навакольных. У Расіі гэтым «калькулюючым» выступіла публічная ўлада, а яе загад – увасабленнем разумнасці права» [5].

Калі ідэя дамінавання ўлады ў правядзенні мадэрнізацыі грамадскага ладу не была чужая традыцыям беларускага народа, то адсутнасць свабоды, падзелу грамадзянскай супольнасці і дзяржавы выклікала непрыманне і актыўны супраціў розных пластоў грамадства Беларусі, у першую чаргу шляхты як «саслоўя, якое ў перыяд Рэчы Паспалітай было найбольш арыентавана на Захад і ўспрыняло яго нормы і каштоўнасці» [11, с. 88].

Пасля прымусовай уніфікацыі права беларускіх губерняў з правам агульнарасійскім, расійскае заканадаўства перажыло яшчэ дзве хвалі прававых запазычанняў заходняга прававога досведу:

- дзяржаўна-прававыя рэформы другой паловы XIX стагоддзя, якія яшчэ больш наблізілі расійскае права да заходняга (арыентацыя ў дзяржаўна-прававых рэформах і ў развіцці тэарэтычнага правазнаўства пераважна на Нямеччыну і Францыю; падрыхтоўка найбольш важных законапраектаў з улікам сусветнага досведу рэгулявання; стварэнне судоў прысяжных і адвакатуры, што прыдало сацыяльную вагу юрыстам у грамадстве);
- рэформы пачатку XX стагоддзя, калі Расія была захопленая хваляй дэмакратызацыі, узорам для якой выступілі заходнія краіны [5].

У выніку гэтых рэформаў у Расіі ў пачатку XX стагоддзя па заходнім узоры была сфармаваная рацыянальна арганізаваная прававая сістэма, якая абапіралася, аднак, на традыцыйныя каштоўнасці дамінавання дзяржавы над грамадствам, успрыманне права як волі дзяржаўнай улады.

Рэформы другой паловы XIX стагоддзя, якія праводзіліся на тэрыторыі Беларусі з некаторымі выключэннямі, і дэмакратызацыя пачатку XX стагоддзя спрыялі развіццю самакіравання на беларускіх землях, дазволілі насельніцтву края накіроўваць дэпутатаў у Дзяржаўную Думу, абумовілі ўспрыманне дзейснага правапарадку як свайго.

**Заключэнне.** Далучэнне земляў Беларусі да Расійскай імперыі ў канцы XVIII стагоддзя выклікала разрыў пераемнасці ў развіцці права Беларусі. Першапачаткова мясцовае права аўтаномна інтэгравалася ў права агульнарасійскае, але ў 30 – 40-я гады XIX стагоддзя прававая аўтаномія на землях Беларусі была ліквідавана. Аднак адрозненні паміж прававымі сістэмамі Расіі і Рэчы Паспалітай часткова згладжваліся распачатымі ў імперыі працэсамі вестэрнізацыі права. Змена пакаленняў і дэмакратызацыя ў Расійскай імперыі дазволілі ў канцы XIX – пач. XX стагоддзя большасці насельніцтва ўспрымаць дзейснае на тэрыторыі Беларусі права як сваё.

## ЛІТАРАТУРА


1. Агінскі, М.К. Праект указа аб новай арганізацыі заходніх губерняў / М.К. Агінскі // Адраджэнне: гіст. альманах / склад. і навук. рэд. А.П. Грыцкевіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1995. – Вып. 1. – С. 212 – 213.
2. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дап. / А.Ф. Вішнеўскі. – Мінск: Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 2003. – 319 с.
3. Жалованная грамота дворянству, 21 апреля 1785 г. // Нац. Интернет-портал Респ. Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь [Электронный ресурс]. – Минск, 2005. – Режим доступа: http://pravo.by/lawhistory/akt_ri05.htm. – Дата доступа: 25.08.2008.
4. Каліноўскі, К. Лісты з-пад шыбеніцы / К. Каліноўскі // Заняпад і адраджэнне: Беларуская літаратура XIX ст. / уклад., прадм. і заўв. У. Казьберука. – Мінск: Маст. літ., 2001. – С. 300 – 307.
5. Князинин, В. Рецепция зарубежного права как способ модернизации российской правовой системы / В. Князинин [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.archipelag.ru/geoeconomics/kapital/ /system/modernization/. – Дата доступа: 23.08.2008.

6. Левская, Л.А. Правовое положение городского населения Беларуси в конце XVIII века / Л.А. Левская // Магдэбургскае права на Беларусі: матэрыялы навук. канф., прысв. 500-годдзю выдачы гораду Мінску граматы на магдэбургскае права, Мінск, 26 сакав. 1999 г. / БДУ; Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь; БНІП; рэдкал.: У.М. Хоміч, Т.І. Доўнар, І.А. Юхо. – Мінск: Права і эканоміка, 1999. – С. 113 – 118.
7. Нольдэ, А.Э. Очерки по истории кодификации местных гражданских законов при графе Сперанском / А.Э. Нольдэ. – СПб.: Сенатская типогр., 1906. – Вып. I. Попытка кодификации литовско-польского права. – 314 с.
8. Об организации управления в присоединенных землях: Указ Екатерины II генерал-губернатору Белорусских губерний, 16 августа 1772 г. // Нац. Интернет-портал Респ. Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь [Электронный ресурс]. – Минск, 2005. – Режим доступа: http://pravo.by/lawhistory/akt_ri02.htm. – Дата доступа: 25.08.2008.
9. Об организации управления в присоединенных от Польши землях: Наказ Екатерины II генерал-губернаторам Псковской и Могилевской губерний, 28 мая 1772 г. // Нац. Интернет-портал Респ. Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь [Электронный ресурс]. – Минск, 2005. – Режим доступа: http://pravo.by/lawhistory/akt_ri01.htm. – Дата доступа: 25.08.2008.
10. Об организации управления и судов на присоединенной к России по третьему разделу Речи Посполитой: Манифест литовского генерал-губернатора, 17 дек. 1795 года // Нац. Интернет-портал Респ. Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь [Электронный ресурс]. – Минск, 2005. – Режим доступа: http://pravo.by/lawhistory/akt_ri07.htm. – Дата доступа: 25.08.2008.
11. Риер, Я.Г. Цивилизации средневековья и начала нового времени: опыт структурного анализа: моногр. / Я.Г. Риер. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2003. – 154 с.
12. Тесля, А.А. Источники (формальные) гражданского права Российской Империи в XIX – начале XX века / А.А. Тесля [Электронный ресурс]. – 2003. Режим доступа: http://civil-law.narod.ru/wissled/teslya/ /index1.html. – Дата доступа: 15.08.2008.
13. Тесля, А.А. Основные этапы эволюции системы источников русского права XIX – начала XX в. / А.А. Тесля [Электронный ресурс]. – 2005. – Режим доступа: http://civil-law.narod.ru/wissled/teslya/doc/. – Дата доступа: 25.08.2008.
14. Чудаков, М.Ф. Конституционный процесс в Беларуси (от Привилея Казимира до Конституции Республики Беларусь): моногр. / М.Ф. Чудаков. – Минск: Акад. упр. при Президенте Респ. Беларусь, 2008. – 290 с.
15. Шелкопляс, В.А. Местные органы государственного управления в Белоруссии в конце XVIII – начале XIX века: автореф. дис. ... канд. юрид. наук: 12.710 / В.А. Шелкопляс; Бел. гос. ун-т. – Минск, 1972. – 18 с.
16. Шелкопляс, В.А. Судебные органы в Беларуси: конец XVIII – первая половина XIX века: учеб. пособие / В.А. Шелкопляс; Акад. МВД Респ. Беларусь. – Минск : Акад. МВД Респ. Беларусь, 1997. – 64 с.


*Паступіў 11.03.2009*